# FORUM NUMIZMATYCZNE

## Studia i Materiały
## № 3

Pod redakcją naukową
Krzysztofa Filipowa

Białystok 2019

Rada Redakcyjna:
Aleksandr Bugrov (Rosja),Krzysztof Filipow (Polska)
Wiktor Kakareko (Białoruś), Valerij Kapeliusznij (Ukraina)
Maciej Karczewski (Polska),Viktor Kotzur (Ukraina), Vasyl Orlyk (Ukraina)
Stanislovas Sajauskas (Litwa), Andrzej Suchcitz (Anglia)
Zbysek Sustek (Słowacja), Stefan Samoila (Rumunia)

Kolegium Redakcyjne:
Redaktor Naczelny: Krzysztof Filipow
Sekretarz Redakcji: Barbara Kuklik

Recenzenci:
Prof. dr hab. Valerij Lastovsky (Ukraina)
Narodowy Uniwersytet Kultury I Sztuki w Kijowie
Prof. dr Aleksandr Bajura (Białoruś)
Państwowy Uniwersytet Techniczny w Brześciu

Seria: Forum Numizmatyczne

Redakcja Naukowa: Krzysztof Filipow

Korekta: Zespół i Autorzy

Projekt okładki i opracowanie techniczne: Barbara Kuklik

Tłumaczenia: Autorzy i Krzysztof Filipow

Foto na okładce: Medal „Bene Merentibus” Fryderyka Augusta (zbiory prywatne)

Publikacja dofinansowana przez Wydział Historyczno-Socjologiczny
i Instytut Historii i Nauk Politycznych Uniwersytetu w Białymstoku

Wszelkie prawa zastrzeżone
Żadna część tej publikacji nie może być reprodukowana i wykorzystywana
w jakiejkolwiek postaci i formie bez wyrażenia pisemnej zgody wydawcy

Wydawca: Ośrodek Badań Europy Środkowo-Wschodniej

ISBN 978-83-950711-3-3
ISSN 0208-0710

Nakład: 100 egzemplarzy
Copyright by Autorzy i Ośrodek Badań Europy Środkowo-Wschodniej
Białystok 2019

**Андрэй Карач**
**(Беларусь)**

# ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІЯ ГРАШОВЫЯ СТАСУНКІ Ў ЧАСЫ ЖЫГІМОНТА СТАРОГА

У часы Вялікага князя літоўскага Аляксандра Ягайлавіча (1492–1506) была праведзена грашовая рэформа, вынікам якой быў выпуск паўгрошаў і пенязяў па літоўскай стапе. У Кракаве у часы Казіміра, а потым і Яна Ольбрахта выпускаліся манеты па кароннай стапе. Застаецца невядомым чаму новыя літоўскія манеты вырашылі выпускаць па сваёй стапе, на 20% лепшай, чым у суседняй Польшчы. Верагодна, гэта рашэнне трэба разглядаць разам з асабістымі амбіцыямі новага Вялікага князя, які вельмі актыўна ўзяўся за рэфармаванне дзяржаўных справаў практычна па ўсіх накірунках.

Адзначым, што польская манета мяжы XV – XVI стст. практычна не паступала на тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага. На сённяшні дзень не зафіксавана ніводнага скарба часоў Аляксандра з тэрыторыі ВКЛ, у якім бы прысутнічалі каронныя манеты. І гэта нягледзячы на спробы па ўраўнаванню грашовых сістэмаў дзвюх краін. Так, па ўмовах Мельніцкай уніі 1501 г., якая юрыдычна афармляла ўладу Аляксандра ў Польшчы, абедзве краіны павінны былі зблізіцца палітычна і эканамічна. Згодна адной з пастановаў гэтай уніі, манета павінна быць аднолькавай і роўнай па вазе ў Літве і Польшчы [1, с. 132]. Аднак, акт гэтай уніі не быў зацверджаны соймам і, фактычна, яго ўмовы не дзейнічалі на тэрыторыі Вялікага кяняства. Дакладна невядома метралогія і чые манеты (Літвы ці Кароны) павінны былі стаць прататыпамі для будучых адзіных эмісій. Уніфікацыі манет дабіваліся палякі і, верагодна, новыя манеты планавалі стварыць на аснове польскіх. Усё гэта паказвае не што іншае, як апасенні Польшчы з нагоды расшырэння рэалізацыі і спажывецкага рынку літоўскіх манет, канкурэнцыі з кароннымі манетамі ў некаторых памежных землях Польшчы і імкненне абмежаваць гаспадарчую самастойнасць Літвы.

Т. Нарбут сцвярджаў, што ў 1503 г. куратар (dozorca) літоўскай мынцы Ян Курзавецкі атрымаў дазвол на біццё польскай манеты ў Гродна [2, с. 202]. Аднак, ніякіх спасылак і крыніц аўтар, на жаль, не прыводзіць. На сённяшні момант падцвержання гэтай інфармацыі няма.

Пасля смерці Аляксандра, ВКЛ апынулася ў вельмі цяжкім становішчы – на Усходзе былі страчаны вялікія тэрыторыі і знешнепалітычная ініцыятыва канчаткова перайшла на бок Маскоўскай дзяржавы. Да таго ж, Аляксандр пакінуў пасля сябе абсалютна пусты скарб. Абараніць краіну маючыміся сродкамі і метадамі было немагчыма. У снежні 1506 г. з Літвы ў Польшчу адправілася прадстаўнічае пасольства, якое сярод іншага выступіла з прашэннем дапамогі "людьми або пенезми на дисеишыи часъ" [3, с. 47]. Ёсць звесткі, што ўжо ў наступных гадах польскія войскі ўдзельнічалі ў ваеннай кампаніі супраць Маскоўскай дзяржавы і мяцежа М. Глінскага [3, с. 77, 114]. Ёсць адрывачныя звесткі аб выплатах наймітам пасля вайны ў канцы 1508 г. [4, с. 147; 406].

У самым пачатку 1507 г. у Вільні сабраўся сейм. Галоўным пытаннем значыўся пошук сродкаў для найму і ўтрымання войскаў. Для яго вырашэння было прынята

рашэнне аб зборы срэбршчыны [4, с. 296-297] – часовага падатку на ваенныя мэты. Неабходнасць найму менавіта польскага войска стала відавочнай. Кароннае войска прынесла з сабою і даволі значную колькасць сваёй манеты – гэта першае заўважнае пранікненне польскай манеты на тэрыторыю ВКЛ. Аднак, мясцовае насельніцтва з недаверам аднеслася да каронных паўгрошаў, што і адлюстравалася ў пастанове наступнага Наваградскага сейму ў чэрвені 1508 г. У дакуменце гаворыцца пра тое, што, так як мынца літоўская яшчэ не пачала выпуск новай манеты, то палякам вельмі цяжка купляць харчаванне для сябе і для коней, не маючы літоўскіх грошай. У сувязі з гэтым устанаўліваецца прымусовы курс польскіх грошай у адносінах да літоўскіх: адзін польскі паўгрош раўняецца чатыром літоўскім пенязям, а польскі грош – васьмі пенязям літоўскім. Далей у дакуменце асабліва адзначаецца, што каронныя манеты абавязаны браць пры разліках (у такіх суадносінах) усе людзі і пры любых абставінах: купля-продаж тавараў, аплата паслуг, падаткаў, мытных плацяжоў і г. д. пад пагрозай суровага пакарання. Таксама для войска ўстанаўліваюцца спецыяльныя кошты на жывёлу і харчаванне асобна ў польскай і літоўскай манеце (Табліца 1) [4, с. 299-300]. Можна пагадзіцца і з думкай М. Любаўскага, які сцвярджаў, што для аплаты паслуг наймітаў-палякаў у вялікакняскім скарбе абсалютна не было грошай, што і адлюстравалася ў сеймавай пастанове аб абавязковым прыняцці польскіх грошай, якія ваяры прывезлі з сабою [5, с. 182].

Аднак, ёсць і іншыя думкі на гэты конт. Напрыклад, М. В. Доўнар-Запольскі сцвярджаў, што ў пачатку XVI ст. у ВКЛ ужо адчуваўся недахоп манеты, і менавіта пагэтаму з’явіўся універсал 1508 г. аб прыёме польскай манеты [6, с. 469]. Але з гэтым нельга пагадзіцца, бо літоўскія эмісіі Аляксандра поўнасцю задавальнялі мясцовыя патрэбы ў манеце. Да таго ж, працягвала быць у абарачэнні значная колькасць праскіх грошаў, шэраг розных ішаземных, у тым ліку, і залатых манет [7, с. 37; 8, с. 16-18].

Сваё бачанне сэнсу гэтага дакумента прыводзіць і беларускі даследчык Ш. І. Бекцінееў, які піша, што у 1508 г. Віленскі манетны двор зноў аднавіў працу і пачаў выпускаць літоўскія паўгрошы, якія былі цяжэйшымі за каронныя. Пагэтаму, 5 чэрвеня 1508 г. быў выдадзены каралеўскі указ аб прыёме польскай манеты па прымусоваму курсу [9, с. 297]. Аднак, з тэкста дакумента дакладна вядома аб тым, што ў сярэдзіне 1508 г. мынца ў Вільні яшчэ не дзейнічае. Па-гэтаму, атаясамляць прыём польскіх манет у ВКЛ з пачаткам віленскіх эмісій не верна.

Выдатнейшы польскі даследчык М. Гумоўскі сцвярджаў, што на Наваградскім сейме 1508 г. Жыгімонт выступіў з прапановай уніфікацыі літоўскай і польскай манеты, аднак, атрымаў рашучы адказ.Таксама ён лічыў, што гэтая пастанова насіла часовы характар, бо ўжо ў тым самым годзе Вялікі князь у сваім лісце да Вармінскага біскупа Лукаша пісаў аб выніках Наваградскага сейму і намеры ўраўнавання дзвюх грашовых сістэмаў [10, с. 26]. Больш такіх намераў Жыгімонт ніколі не выказваў і па-ранейшаму літоўская манета была больш вартасней за каронную аж да рэформаў Стэфана Баторыя. Відавочна, што любыя спробы ўніфікацыі грашовых сістэмаў дзвюх краін натыкаліся на жорсткае супрацьдзеянне з боку кіруючых колаў ВКЛ.

Хутчэй за ўсё, менавіта на гэтым сейме таксама было прынята рашэнне аб адкрыцці Віленскай мынцы, бо вайна патрабавала вялікіх сродкаў для аплаты наймітаў. Трошкі іншую прычыну згадваў М. Гумоўскі, які лічыў, што літвіны не жадалі мірыцца з намерамі Жыгімонта аб ўраўнаванні дзвюх сістэмаў і адразу ж выказалі намер па адкрыцці Віленскай мынцы і працягу біцця ўласных манет па

старай стапе [10, с. 26]. Ужо ў канцы 1508 г. года была выбіта першая манета з імем Жыгімонта – першы датаваны паўгрош з датай [11, с. 36].

У Польшчы кракаўская мынца пачала выпуск паўгрошаў на год раней, чым літоўская ў Вільні: 30 красавіка 1507 г. з'явіўся каралеўскі універсал аб біцці манеты, у якім была падцверджана папярэдняя манетная стапа для паўгрошаў [12, с. 106-107]. 25 мая 1507 г. была зноў адчынена Кракаўская мынца, якая выпускала толькі паўгрошы. Менавіта гэты намінал на бліжэйшы час стаў галоўным у грашовым абарачэнні Каронных зямель. Такая папулярнасць садзейнічала з'яўленню адносна вялікай колькасці падробак. Сітуацыю ўскладняла і "дзейнасць" кароннага падскарбія Пятра Курзавецкага, які выпускаў у вялікіх колькасцях вельмі падобныя да арыгінальных, але менш вартасныя паўгрошы. Вялікая маса падробак была ў абарачэнні разам з афіцыйнымі эмісіямі. Усё гэта прывяло да того, што насельніцтва з недаверам адносілася да паўгрошкавай манеты, якая "страціла свой аўтарытэт" на мясцовых грашовых рынках. Петракоўскі сейм 1510 г. загадаў палепшыць якасць сваёй манеты і наблізіць яе па гэтаму паказчыку да літоўскай і прускай, але гэтага не адбылося і 15 лютага 1511 г. Жыгімонт загадвае зачыніць кракаўскую мынцу [13, с. 45].

Да пагаршэння сітуацыі з польскай манетай спрычыніўся пляменнік Жыгімонта Старога кароль Чэхіі і Венгрыі Людвіг Ягелон, які, пачынаючы з 1517 г., актыўна выпускаў свае паўгрошы. Яны былі лягчэйшыя за каронныя і месцілі ў сваім складзе на 10% меней срэбра і массава паступалі на польскія землі [7, с. 37-38].

Канешне ж, польскія ўлады не жадалі мірыца з усім гэтым манетным хаосам, які меў месца на каронных рынках. Даволі нестандартная гісторыя, звязаная з пералікамі курсаў, адбылася ў 1514 г. Як вядома, для нармальнага функцыянавання манетнага двара патрабавалася значная колькасць солі, пры дапамозе якой адбельваліся манеты. 30 траўнем 1514 г. датуецца ліст Жыгімонта да веліцкага жупніка, у якім Гаспадар просіць запісаць на яго рахунак 2 балваны солі для мынцы. У дакуменце пазначана, што кіраваў гэтай місіяй "Magister monetarius Mg. dukatus Lithuanie", аднак, канкрэтнага імя не пазначана. Верагодна, гэта быў сам Ульрых Гозі – кіраўнік віленскага манетнага двара. Літоўцы жадалі разлічыцца за соль сваёй манетай па вызначанаму курсу да кароннай манеты, як 4 да 5. Але гэта не задаволіла палякаў, якія не жадалі прымаць літоўскую манету па большаму курсу. [14, с. 108]. Такая сітуацыя і вымусіла ўмяшацца ў справы Жыгімонта. Чым закончылася гэтая гісторыя з крыніц невядома. Але можна меркаваць, што палякі былі вымушаны прыняць літоўскую манету па ўстаноўленаму дзяржавай кошту.

Канешне ж, ў Польскім Каралеўстве літоўскія паўгрошы не жадалі прымаць па большаму курсу. На наступны Вальны сейм, які сабраўся на Вавелі ў 1515 г. была даслана вялікая колькасць скаргаў з гэтай нагоды. I Жыгімонт пайшоў насустрач польскім паслам і здзейсніў беспрэцэндэнтны крок – пасля сейма спецыяльным універсалам зацвердзіў парытэт віленскіх і кракаўскіх паўгрошаў [14, с. 338]. Узнікла камічная сітуацыя: на тэрыторыі ВКЛ літоўскія паўгрошы былі на 1/5 паўнавартасней каронных і прымаліся па курсу 4 літоўскіх пенязя за адзін каронны паўгрош. А на тэрыторыі ўсіх старостваў каронных зямель аднанамінальныя манеты (у дадзеным выпадку паўгрошы) ўраўноўваліся ў сваіх коштах [15, с. 40].

Выкананне гэтага рашэння на месцах, напр., у памежным падляшскім Драгічыне, патрабавала нават умяшання Вялікага князя. Войт і дарагіцкія мяшчане скардзяцца Жыгімонту на мясцовага старасту Пятра Станіслававіча Кішку. Адной з прэтэнзій

значыцца тое, што стараста наказвае *“лічбаю шырокай гандляваць – па дзесяці пенязей у грош, а мы здаўна лічбай вузкаю гандлявалі – па васьмі пенязей у грош”* [16, с. 85]. Іншымі словамі мясцовых жыхароў прымушалі весці разлікі згодна літоўскай грашовай сістэмы, а яны здаўна былі ў вектары кароннай. Гэты горад палітычна і эканамічна быў больш звязаны з Польшчай чым з ВКЛ, таму і рознасць курсаў аднолькавых літоўскіх і польскіх наміналаў выклікала спрэчкі.

Згодна адной з пастаноў Віленскага сойма 1534 г. устанаўлівалася срэбршчына на тры гады. 20 лістапада, адзначаючы памер другой срэбршчыны на 1535 г., Вялікі князь выдаў ліст, згодна якому падатак можа брацца і ў польскай манеце. У дакуменце ўказвалася розніца, якая павінна быць даплочана, калі плата прымаецца кароннымі манетамі: *“за чотыри гроши литовскихъ маеть брано быти полскихъ пять грошей, а на копу литовскую полскихъ пенязей маеть наддавано быти петнадцать грошей – то копа литовская будеть чинити полских пенезей полосмадесять грошей* (75 – А. К.); а в Полщи также за копу литовскую маетъ давано быти по полосмадесятъ грошей; и тымъ бы есте способомъ оную мынцу брали и бирчымъ нашымъ до скарбу нашого давали, а они то отъ васъ маютъ приймовати; а вы бы также тую мынцу отъ подданыхъ своихъ приймовали” [5, прил. № 14].

Пры зборы чарговай срэбршчыны ў канцы 1534 г. Жыгімонт палічыў неабходным яшчэ раз падкрэсліць, што для гэтых мэтаў павінна брацца і польская манета па строга вызначанаму курсу: 5 польскіх грошай = 4 літоўскім, у літоўскай капе мусіць быць 75 польскіх грошай [5, с. 267].

Верагодна, што на месцах гэтыя рашэнні зноў не выконваліся, бо 17 жніўня 1535 г. Жыгімонт дасылае ліст да паноў радных, у якім падцвярджае, што літоўская манета ў Польшчы павінна брацца па раней вызначаных курсах [17, с. 51-52].

Верагодна, такія частыя напамінанні аб суадносінах польскага і літоўскага гроша сведчылі аб пэўным недаверу ў ВКЛ да кароннай манеты.

Такім чынам, падсумуем: дзякуючы розным метралагічным характарыстыкам аднанамінальных польскіх і літоўскіх манет, на месцах пры шэраговых разліках узнікалі парадаксальныя сітуацыі, калі людзі ішлі насуперак каралеўскім і вялікакняскім пастановам і універсалам. У шэрагу выпадкаў, як мы бачылі, без умяшання самога Жыгімонта, справы не вырашаліся. На тэрыторыі ВКЛ скаргаў на тое, што польскую манету не жадалі прымаць па курсу літоўскай пакуль не выяўлена. Таксама трэба адзначыць, што ў часы сына Жыгімонта Старога – Жыгімонта Аўгуста падобныя выпадкі практычна не сустракаюцца, бо, з увядзеннем у грашовую сістэму новых наміналаў, насельніцтва ўжо прызвычаілася да практыкі хуткіх пералікаў.

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры:

1. Volumina legum: w 9 t. / Przedruk zbioru praw staraniem xx. pijarow w Warszawe, od roku 1732 do roku 1782, wydanego. – Petersburg: Nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1859–1860. – T. 1: Ab anno 1347 ad annum 1547. – 1859. – XXI, 288, XII s.

2. Narbutt, T. Dzieje starożytne narodu litewskiego. Tom 1: Mitologia Litewska / T. Narbutt. – Wilno: A Marcinowski, 1835. – XV, 482 s.

3. Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 7 (1506–1539). Užrašymų knyga 7 / parengė I. Ilarienė, L. Karalius, D. Antanavičius. Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2011. – XXX, 1012 p.

4. Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 8 (1499–1514). Užrašymų knyga 8 / parengė A. Baliulis, R. Firkovičius, D. Antanavičius. – Vilnius: Moksloirenciklopedijų leidykla, 1995. – 709 p.

5. Любавский, М. К. Литовско-русский Сейм / М. К. Любавский. – М.: Университетская типография, 1900. – 850, 232, LXXII с.

6. Доўнар-Запольскі, М. В. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах / М. В. Доўнар-Запольскі; падрыхт. да друку: А. І. Груша, Р. А. Аляхновіч; увод. арт.: Д. У. Караў, А. У. Унучак, А. І. Груша; камент.: А. І. Груша, Ш. І. Бекцінееў, Л. Каралюс. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 759 с.

7. Карач, А. У. Грашовае абарачэнне на землях Вялікага княства Літоўскага ў канцы XV – 1570-х гг. / А. У. Карач // Веснік ГрДУ імя Я. Купалы. – Серыя 1. – 2014.– № 1. – С. 36-40.

8. Масько, И. Золото в денежном обращении Великого княжества Литовского в конце XV – начале XVI века / И. Масько // Банкаўскі веснік. – 2006. – №4. – С. 16-18.

9. Бектинеев, Ш. И. Денежное обращение на территории Беларуси в IX – XVI веках: нумизматические исследования / Ш. И. Бектинеев. – Мн.: Беларуская навука, 2014. – 509 с.

10. Gumowski, M. Mennica wileńska w XVI i XVII w. / M. Gumowski. – Warszawa, 1921. – 200 s.

11. Huletski, D., Bagdonas, G., Darashkevich M. / D. Huletski, G. Bagdonas, M. Darashkevich. – Early Lithuanian half-groats 1495–1529 – Kaunas, 2017. – 174 p.

12. Zagórski, I. Monety dawnej polski / I. Zagórski. – Warszawa, 1845. – V, 191, XVIII s.

13. Terlecki,W. Reformy monetarne Zygmunta I / W. Terlecki //Wiadomości Numizmatyczne.– 1963. – №2. – S. 43-59.

14. Acta Tomiciana. T. III (1514-1515). 1853. – 450, 25 s.

15. Карач, А. У. Аб лічбах у ВКЛ у XVI ст. / А. У. Карач // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навуковы зборнік. – 2016. – Вып. 11. – С. 38-45.

16. Lietuvos Metrika (1522–1530). 4-oji Teismų bylų knyga / parengė S. Lazutka, I. Valikonytė ir kt. – Vilnius: Vilniaus universiteto leidykla, 1997. – 514 p.

17. Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 19 (1535 – 1537). Užrašymų knyga 19 / parengė D. Vilimas. – Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2009. – 362 p.

**Табліца 1. Устаноўленыя спецыяльныя кошты для войска на жывёлу і харчаванне асобна ў польскай і літоўскай манеце (згодна пастановы Наваградскага сойма 1508 г.)**

| | Польскія грошы | Літоўскія грошы |
|---|---|---|
| Вол | 30 | 24 |
| Ялавіца | 15 | 12 |
| Вепр | 10 | 8 |
| Баран | 2,5 | 2 |
| Гусь (2 шт.) | 1,2 | 1 |
| Курыца (4 шт.) | 1,2 | 1 |
| Качка (3 шт.) | 1,2 | 1 |
| Жыта (капа) | 4 | 3 |
| Авёс (капа) | 2,5 | 2 |

**POLISH-LITHUANIAN PENNY RELATIONS IN THE TIME OF SIGISMUND THE OLD**
**Summary**

The article looks into the Polish-Lithuanian monetary relations during the time of Sigismund I the Old (the first third of the 16th century). It also examines the causes of the beginning of the massive inflow of the Crown coins into the lands of the Grand Duchy of Lithuania. Lithuanian half-grosh contained 20% more silver than its Polish counterpart. This fact caused huge problems with the turnover of the higher-quality Lithuanian coins in Poland as they were simply not accepted at the forced exchange rate fixed by the Polish side. At the same time, there is no recorded evidence of exchange problems with Lithuanian coins on the territory of Poland.

## SPIS TREŚCI

**Vasyl Orlyk (Ukraine)**
**New Facts on Modern Fake Coins of the Crusader States 5**

**Какареко Виктор (Беларусь)**
**КЛАД МОНЕТ X–XI ВВ. ИЗ ЛЮДВИЩА : ВЕРСИИ ПРОИСХОЖДЕНИЯ 19**

**Андрій Крижанівський, Ігор Яковеліс (Україна)**
**НОВІ ЗНАХІДКИ ЛЬВІВСЬКИХ МОНЕТ XIV-XV СТОЛІТЬ 28**

**Андрэй Карач (Беларусь)**
**ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІЯ ГРАШОВЫЯ СТАСУНКІ Ў ЧАСЫ ЖЫГІМОНТА СТАРОГА 39**

**Witold Garbaczewski (Polska)**
**TALAR KORONNY STEFANA BATOREGO Z 1578 ROKU 45**

**Jarosław Dutkowski (Polska)**
**MEDALE PAMIĄTKOWE I MEDALOWE KLEJNOTY NA ŚLĄSKU I NA POMORZU W XV I NA POCZĄTKU XVII. JAKO PRZYKŁAD HAGIOGRAFII LOKALNYCH PANÓW 54**

**Віктор Коцур (Україна)**
**АНТИКВАРНІ ПІДРОБКИ ТАЛЕРІВ НА НУМІЗМАТИЧНОМУ РИНКУ УКРАЇНИ 64**

**Дзьмітрый Мацеша (Беларусь)**
**АБ НОВЫХ ЗНАХОДКАХ ПОЛЬСКІХ ЛІЧМАНАЎ 72**

**Tomasz Maćkowski (Polska)**
**WOKÓŁ SYMBOLU ORŁA – O TRUDNOŚCIACH INTERPRETACYJNYCH IKONOGRAFII TOKENÓW GDAŃSKICH 77**

**Валерій Нечитайло (Україна)**
**ФАЛЬШУВАННЯ МОНЕТ РЕЧІ ПОСПОЛИТОЇ ТА ЗАХІДНОЇ ЄВРОПИ НА ТЕРИТОРІЇ КОЗАЦЬКОЇ ДЕРЖАВИ УКРАЇНИ-ГЕТЬМАНЩИНИ У ДРУГІЙ ПОЛОВИНІ XVII СТОЛІТТЯ 87**

**Виктор Малежик (Беларусь)**
**КЛАД МОНЕТ XVII-XVIII ВВ. ИЗ ДЕРЕВНИ НОВОСЕЛЬЕ СТОЛБЦОВСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (БЕЛАРУСЬ) 94**

**Adam Musiałowski (Polska)**
**NUMIZMATYCZNE FRAGMENTY W PRASIE TORUŃSKIEJ CZASU STANISŁAWOWSKIEGO 102**

Алла Істоміна (Україна)
ІСТОРІОГРАФІЧНІ ДЖЕРЕЛА З ІСТОРІЇ ФІНАНСОВОЇ ПОЛІТИКИ УРЯДУ РОСІЙСЬКОЇ ІМПЕРІЇ В УКРАЇНІ (1861 – 1917 РР.) 119

Вікторія Павленко (Україна)
ГРОШОВА РЕФОРМА С.Ю. ВІТТЕ В НАДДНІПРЯНСЬКІЙ УКРАЇНІ: ДЕЯКІ ПИТАННЯ ІСТОРІОГРАФІЇ 128

Joanna Lipinin (Polska)
UDZIAŁ POLAKÓW W POWSTANIU KOLEI WSCHODNIO-CHIŃSKIEJ I ROZWOJU MIASTA HARBIN W LATACH 1896-1920 134

Крицук Роман, Янович Артур (Беларусь)
НОВЫЕ ДАННЫЕ О «МОНЕТАХ» МИНДОВГА II 1918 Г. 140

Juliusz Bieniaś (Polska)
GRUZJA, ARMENIA I AZERBEJDŻAN – PAŃSTWA NIEPODLEGŁE W LATACH 1918 – 1921 144

Zbyšek Šustek (Słowacja)
POWSTANIE WALUTY CZECHOSŁOWACKIEJ PO I WOJNIE ŚWIATOWEJ 158

Андрій Бойко-Гагарін (Україна)
ПОЛЬСЬКІ ВІДЗНАКИ КОРОЛІВСЬКИХ СУДДІВ В КОЛЕКЦІЇ НМІУ 192

Krzysztof Filipow (Polska)
PIENIĄDZ OBOZÓW KONCENTRACYJNYCH PIENIĄDZE WIĘŹNIÓW 199

Александра Воробьева, Елена Дивинская (Беларусь)
ПЕРВАЯ МИРОВАЯ ВОЙНА: ДОКУМЕНТАЛЬНЫЕ СВИДЕТЕЛЬСТВА ИЗ КОЛЛЕКЦИИ МУЗЕЙНОГО ФОНДА НАЦИОНАЛЬНОГО БАНКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ 209

Олексій Шевчук (Україна)
РЕФОРМУВАННЯ ГОТІВКОВОГО ГРОШОВОГО ОБІГУ В УКРАЇНІ В 2018 РОЦІ 221